2. Капилов А., Ахвердова Е. Музыкальная культура Беларуси XIX – начала XX вв. – Мн., 2000. – С. 9.
3. Белза И. История польской музыкальной культуры. Т.II. М.: Музыкальное издательство, 1957. – С. 47.
4. Воспоминания Ф. Булгарина. – СПб., 1846. Ч. 1. – С. 123 – 124.

© А. Э. Міланіч, 2003

## ПРАБЛЕМА МІФАЛАГІЗМУ Ў МАСТАЦТВЕ РУСКАГА МАДЭРНУ

Рускае мастацтва мяжы XIX – XX стагоддзяў не менш за іншыя галіны культуры адчула на сабе ўплыў пераходнага перыяду ў гісторыі Расіі. Імкненне да абнаўлення і пераасэнсавання літаральна ўсіх бакоў жыццядзейнасці чалавека зрабіла бачнай крызісную сітуацыю ў рускім мастацтве канца XIX стагоддзя. Спробай выхаду з гэтага становішча для многіх дзеячаў культуры стаў зварот да стылістыкі мадэрну.

Стыль мадэрн аб'яднаў у адно цэлае не толькі ўсе віды мастацтва, не толькі разнастайныя прыметы гістарычных мастацкіх стыляў і напрамкаў, але і мастацтва, з аднаго боку, і акаляючую чалавека паўсядзённасць – з іншага. Мадэрн называлі ў той час "вянцом мастацкага развіцця" еўрапейскай культуры. Сінтэз мадэрну, на думку мастакоў пачатку XX стагоддзя, заснаваны ў большай ступені на прынцыпе стварэння "новай рэчаіснасці", гэта значыць на пераўвасабленні рэчаіснасці сродкамі мастацтва, эстэтызацыі і тэатралізацыі побыту. Толькі мастацтва валодала магчымасцю ўтварэння новай прасторы быцця, у якой сустракаліся мінулае і сучаснасць.

Само ўзнікненне "стылю жыцця" мадэрн нагадвае стварэнне "штучнай" рэчаіснасці сродкамі мастацтва, стварэнне міфа пра жыццё як пра твор мастацтва. Мастак стварае дэкарацыі, у якіх жыццё працякае як спектакль з пэўным сюжэтам і ва ўжо зададзенай інтэрпрэтацыі. Сюжэт не запазычаны з навакольнай рэчаіснасці, ён прыдуманы мастаком. І фантастыка выяўляецца не ў дэталях, не ў кампазіцыі, а ва ўзнаўляльных сітуацыях, дзе мінулае вытанчанай стылізацыяй урываецца ў сучаснасць. Даследчык мадэрну Д.Сараб'янаў піша аб "новай" міфалогіі, якая "ўзнікае пры дапамозе культурнай памяці" [2, с. 268]. Але калі раней міф быў спосабам пазнання рэчаіснасці, то ва ўмовах развіцця рускага мастацтва пачатку XX стагоддзя міф становіцца нярэдка прыёмам утойвання ісціны замест яе раскрыцця. Ён дазваляе мастаку балансаваць на мяжы паміж бачным і нябачным, уяўным і тайным і ўтрымлівае элемент гульні. "У руках мастака мадэрну міф падобны да маскі. Надзяваючы яе на твар мадэлі ці на свой твар, мастак і хавае, і адначасова адкрывае сваю сутнасць. Ісціна застаецца да канца нераскрытай" [2, с. 268].

Працэс міфалагізацыі ў розных відах мастацтва ідзе рознымі шляхамі. І найбольш паслядоўна ён выяўляецца ў жывапісе і графіцы. Найбольш просты шлях звязаны з выкарыстаннем традыцыйных міфалагічных сюжэтаў, дзе ілюстрацыя міфа разлічана на агульнапрынятае разуменне (шматлікія "Саламеі", "Юдыфі").

Але выкарыстанне міфалагічнага сюжэта можа быць своеасаблівым сродкам далучэння да міфалагічнага мыслення. Так, міф, які з'явіўся сродкам спасціжэння рэчаіснасці, вызначыў стылёвыя асаблівасці позніх твораў В.Сярова на антычныя сюжэты ("Адысей і Наўзікая", "Выкраданне Еўропы"), патрабуючы ад мастака аб'яднання ўмоўнасцей самога міфа, гістарычнай эпохі і жывапіснасці мовы. Мастак быццам бы "ўжываецца" ў міф, імкнецца авалодаць ягонай паэтыкай. Майстрам, які мае дачыненне, у адрозненні ад аўтараў акадэмічных "антычных" сцэн, да сутворчасці ў стварэнні міфалагічнага свету Старажытнай Грэцыі, успрымаецца і Л.Бакст. Яго тэатральныя працы, яго часопісная графіка з антычнымі матывамі аказваліся ў сістэме мастацкіх умоўнасцяў мадэрну своеасаблівым сімвалам духоўнага свету і паэзіі старажытных часоў. Рамантычная міфатворчасць Л.Бакста заснавана на такіх формах пераўтварэння жыцця, якія сінтэзуюць выяўленчае мастацтва, паэзію, музыку, высоўваючы на першы план уяўленне аб дамінуючай ролі прыгажосці.

Яшчэ адзін спосаб міфалагізацыі – гэта відазмяненне традыцыйнага сюжэту, прыстасаванне яго да суб'ектыўнай патрэбы мастака ці да нацыянальнай традыцыі. Прыкладам гэтага можа служыць "Пан" М.Врубеля, дзе антычны бог набывае славянскі характар. Даследчык творчасці М.Врубеля Н.Тамручы вызначае адносіны мастака да мадэрну як балансіраванне паміж рэчаіснасцю і фантазіяй ў карціне свету Врубеля, у прыродзе ягоных стылёвых пошукаў. Так, рамантычна ўмоўны свет бачны ў "Царэўне-Лебедзь", дзе птушка-жанчына намалявана ў рамках тэатральнай сцэны. Мастак быццам падвойвае гэтым тую ўмоўнасць, якая характэрна для мастацтва мадэрну. У гэтым выпадку М.Врубель і сам становіцца міфатворцам.

Самым чыстым выяўленнем новай міфалогіі была ўласная міфатворчасць мастакоў. Мастак як быццам стварае свой міф, абапіраючыся на "вопыт" міфалогіі, імкнучыся прытрымлівацца яе законаў і выпрацаваных нормаў. Міф адпавядае мастацкім пошукам гэтага часу – імкненню пераўтвараць рэчаіснасць, захоўваючы натуральнымі некаторыя яе бакі ці выяўленні. У такім міфатворчым пачатку стылю мадэрн магчымы самыя разнастайныя варыянты. Напрыклад, спроба выкарыстання дзеячамі "Свету мастацтва" сваёй паэтыкі і стылістыкі ў стварэнні рэальнай абстаноўкі "прыватнага" жылля ("сталовая" А.Бенуа і Е.Лансерэ, "будуар" Л.Бакста, "чайны пакой" К.Каровіна). Як і карціны мастакоў "Свету мастацтва", гэтыя інтэр'еры ўтрымлівалі ў сабе элемент містыфікацыі, гульні ў паэзію і прыгажосць. Сама сістэма архітэктурнага афармлення ўспрымалася як чыстая дэкарацыя, накладзеная на сцены ў выглядзе шпалераў. Прызначаныя для паўсядзённага побыту і абстаўленыя з улікам практычных патрэб, гэтыя "пакоі" найперш былі відовішчам, якое стаяла над гэтым побытам і адмаўляла яго.

Зразумела, міфалагізм не з'яўляецца рысай, якая належыць выключна мадэрну. Але ў мадэрне міфалагічнасць мыслення становіцца адной з вызначальных рыс дзеячаў мастацтва, азначаючы гэтым шлях да мастацкіх сістэм XX стагоддзя.

*Літаратура:*

1. Борисова Е.А. Стернин Г.Ю. Русский модерн. – М.: Сов. художник, 1990. – 360 с.
2. Сарабьянов Д.В. Стиль модерн. – М.: Искусство, 1989. – 294 с.
3. Тамручи Н.О. Проблема мифологизма в творчестве Врубеля // Сов. искусствознание'82 / Редкол.: Полевой В.М. и др. – М.: 1983. – Вып. 1. – С. 92 – 118.